**Прадпрымальнікі зноў выйдуць пратэставаць на Кастрычніцкую плошчу**

## 21. 01. 2008

Прыватныя прадпрымальнікі маюць намер правесьці акцыю пратэсту на Кастрычніцкай плошчы Менску 21 студзеня. Гэтую прапанову, як паведамляе БелаПАН, якая была агучана сёньня на мітынгу адным зь лідэраў кампаніі «За свабоднае равіцьцё прадпрымальніцтва» Аляксандрам Талстыка, падтрымалі ўдзельнікі акцыі пратэсту ў Менску.

Сваю прапанову актывісты матывавалі тым, што прадпрымальнікам неабходна больш кансалідавацца, правесьці агітацыйную працу ў буйных гарадох і Менску.

Актывісты таксама паведамілі, што ў студзені прыватныя прадпрымальнікі ня будуць

**Спецвыпуск! Спецвыпуск! Спецвыпуск! Спецвыпуск! Спецвыпуск! Спецвыпуск! Спецвыпуск!**

Распечатай на ксероксе
и подари друзьям и знакомым!

**Спецвыпуск! Спецвыпуск! Спецвыпуск! Спецвыпуск! Спецвыпуск! Спецвыпуск! Спецвыпуск!**


# НАШ Магілёў

Спецвыпуск, Сьнежань, 2008 год

Незалежнае грамадзка - палітычнае выданьне Горада

24

www.nmahileu.org


Эксклюзыўнае інтэрв'ю



Валадар Цурпанаў, "Рушэньне", Магілёўская лучнасьць, Дыктатар плошчы 10 студзеня 2008 года

## Цяжка дыхаць у краі дзе ўсё моцна карумпавана

**Чаму я ў апазыцыі да сучаснай улады?**

Я б сказаў, што я ў апазыцыі да любой улады. Гэта вышэй за мяне, гэта нейкае маё пакліканьне ад Творцы. Я мушу абараняць людзей, бо па сваёй натуры я праваабаронца.

**З чаго ўсё пачыналася?**

Усё пачыналася, калі я працаваў на заводзе "Магілёўсельмаш" і мяне перавялі з разраду майстра ў звычайныя рабочыя. На завод я патрапіў па размеркаваньні пасьля сканчэньня магілёўскага політэхнікума. Склалася сытуацыя, пры якой кіраўніцтву цэху неабходна было знайсьці "козла отпущения", якім аказаўся я. У выніку мне проста прапанавалі перайсьці зварнікам у другі цэх, каб не правакаваць судовую справу, бо са мной абышліся, мякка кажучы, несправядліва. Праз кароткі час я сутыкнуўся з фактамі ўціску рабочых завадзкім начальствам. Мы былі вымушаны з гэтым змагацца і бараніцца. З таго часу я стаў на сьцяжынку па абароне правоў людзей, чым і займаюся да гэтага моманту. Уступіў у Беларускі Народны Фронт, займаўся грамадзкай дзейнасьцю. Зараз уваходжу ў "Рушэньне", якое заснаваў Уладзімер Мацкевіч.

**Ці праяўляецца ціск з боку ўлады? Наколькі цяжка быць пад ціскам?**

Прыкметы ціску былі ўвесь час. За сваю грамадзкую дзейнасьць я шмат разоў затрымліваўся міліцыянтамі і адседжваў суткі. Я заўсёды казаў, што калі ты становішся ў апазыцыю да сучаснай ўлады, то ты павінен быць бездакорным з прафэсійнага пункту погляду, таму я заўсёды імкнуўся быць калі не самым лепшым спэцыялістам дзе працаваў, то быць сярод самых лепшых. Я ніколі не меў залежнасьці ад шкодных звычак, не спазьняўся на працу і раней не зыходзіў зь яе. З гэтага боку ўлада не магла да мяне падкапацца. Ціск існуе, бо натуральна вельмі цяжка дыхаць у гэтым краі дзе ўсё моцна карумпавана.

**Працяг на другай старонцы**

# 10. 01. 2008

Андрэй Воўкаў

**Каля 300 прадпрымальнікаў выйшлі а 10-ай раніцы на плошчу Леніна ў Магілёве на акцыю пратэсту.**
**На мітынгу было высунута два патрабаваньні: адмена Указа прэзыдэнта, які забараняе прадпрымальнікам мець наёмных працаўнікоў і прыняцьцё Закона аб прадпрымальніцтве, малым і сярэднім бізнэсе. Была створана дэлегацыя, якая давяла патрабаваньні да кіраўніцтва аблвыканкаму. Па абодзьвух пытаньнях прадпрымальнікам адказалі адмоўна і параілі пашукаць новае месца на біржы працы.**



Магілёў, плошча Леніна, 10 сьнежня 2008 году

Мерапрыемства, якое арганізавалася стыхійна, набыла сыстэмны выгляд дзякуючы ўмяшальніцтву Валадара Цурпанава, вядомага грамадзкага акывіста. Ён прагаласіў сябе камандзірам плошчы, вышыхтаваў удзельнікаў у кола й дапамог выпрацаваць канкрэтныя патрабаваньні.

- Мы тут, каб дамагчыся Свабоды, бо Свабода – гэта Закон, - прагаласіў Валадар на мітынгу. - Сюды павінны прыйсьці студэнты й пэнсіянэры, каб падтрымаць нас. Сёньня ўлада пазбаўляе вас працы і нічога не прапануе ўзамен. Вы іх корміце, а яны вас ужо дзесяць гадоў душаць. Зараз накінулі апошнюю ўдаўку. У вас няма выбару: альбо перамагчы, альбо памерці. А калі ня будзеце змагацца, вас задушаць, каго сёньня, а каго – праз год.

Супрацоўнікі міліцыі спрабавалі працiснуцца да Цурпанава, але ім ня ўдалося прайсьці праз шыхты прадпрымальнікаў.

У сваім звароце да прадпрымальнікаў Цурпанаў таксама адзначыў, што пэнсіянэры і студэнты павінны падтрымаць іх, таму што чым болей прадпрымальнікаў і лепей яны працуюць – тым болей будуць пэнсіі і стыпэндыі, маяўляў, каб нашыя пэнсіянэры маглі адпачываць на Гаваях.

У гэтый жа час натоўп больш хвалявала не тое, як пэнсіянэрам адпачыць на Гаваях, а як элемэнтарна выжыць:

*- Я інвалід з нараджэньня, - гаворыць прадпрымальніца з Менскага рынку, - адна без мужа выхоўваю сына. Пэнсія 240 тысячаў рублёў. Зараз мне забаранілі мець наёмных, за прылаўкам я стаяць не магу, як мне жыць? Але ў скрайнім выпадку я вазьму мыліцы (кастылі) й буду стаяць на кірмашы з мыліцамі. У мяне хворыя ногі, але здаровая галава і здаровае сэрца, я хачу жыць і працаваць, хачу выхаваць сына.*

Яе калегу таксама прывяло на плошчу далёка не жаданьне адпачываць на Гаваях:

*- Мне 56 гадоў, пэнсія 240 тысячаў рублеў. За кватэру я аддаю 100 тысячаў, за лекі – таксама 100 тысячаў, як мне жыць на 40 тысячаў?*

Падчас мерапрыемства была дасягнут дамова, што кіраўніцтва аблвыканкама сустрэнецца з дэлегацыяй прадпрымальнікаў у колькасьці 10 чалавек. У склад дэлегацыі ад дэмакратаў увайшлі Рыгор Кастусёў і Сяргей Фамін. Было высунута два патрабаваньні: адмена Указа прэзыдэнта, які забараняе прадпрамальнікам мець наёмных працаўнікоў і прыняцьцё Закона аб прадпрымальніцтве, малым і сярэднім бізнэсе.

Са словаў Рыгора Кастусёва, кіраўніка абласной філіі БНФ, з дэлегатамі сустрэўся Мікалай Снапкоў, намесьнік старшыні аблвыканкаму. Снапкоў заявіў, што на адмену Указу ён паўплываць ня можа й, адпаведна, ніякага ліста прэзыдэнту пісаць не стане, а што тычыцца Закону, пэўныя прапановы ён «давядзе да Менску»:

*- Размова доўжылася больш за гадзіну, акрамя асноўных патрабаваньняў абмяркоўваліся прыватныя моманты, ня вельмі прыемна абмяркоўваліся, - гаворыць Кастусёў.*

*- Нам параілі зьвярнуцца на біржу, каб знайсьці сабе іншую працу, - сказаў адзін з дэлегатаў.*

Пасьля таго, як быў атрыманы адказ, прадпрымальнікі пачалі разыходзіцца. Было прынята рашэньне сабрацца яшчэ раз, але ў большай колькасьці.

*- Калі па-правілах, дык народу павінна прыйсьці болей, - кажа Генадзь, адзін з актывістых - прадпрымальнікаў, - я не прыхільнік стыхійных акцыяў. А ўвогуле, трэба набіраць аўтобусы й ехаць на Менск, да таго хто піша законы...*

*- У першую чэргу трэба стварыць аргкамітэт і выпрацаваць плян дзеяньняў, - пракамэнтаваў сытуацыю прысутны на плошчы Юры Новікаў, намесьнік старшыні Свабоднага прафсаюзу Беларускага. - Па Беларусі 200 тысячаў прадпрымальнікаў, плюс на кожнага прыходзіцца прыблізна два наёмных працаўніка – гэта велічэзная сіла, якая сапраўды можа усё памяняць. У дадзены момант, усё ў руках саміх прадпрымальнікаў.*

Мітынг прайшоў без затрыманьняў. Напрыканцы мітынгу, палкоўнік міліцыі Алёнушкін стыхійна пачаў размаўляць з прысутнымі. Ён абвінаваціў апазыцыю ў тым, што яны выкарыстоўваюць прадпрымальнікаў. На што з натоўпу яму адказалі, што прыйшлі сюды, каб абараніць сваю працу, сваю сям'ю.

## Тым часам, акцыі пратэсту прадпрымальнікаў адбыліся ва ўсіх рэгіёнах Беларусі

Як паведамляе БелаПАН, у Менску а 12.00 на Кастрычніцкай плошчы сабралося па розных ацэнках ад тысячы да трох тысячаў чалавек. Сярод прысутных былі лідэр РГА «Пэрспэктыва» Анатоль Шумчанка, старшыня АГП Анатоль Лябедзька, палітык Аляксандар Мілінкевіч.

Падчас акцыі адбыліся перамовы дэлегацыі прадпрымальнікаў з прадстаўнікамі Адміністрацыі прэзыдэнта.

## Перамовы з прадстаўнікамі Адміністрацыі прэзыдэнта цалкам правалены

- Перамовы з прадстаўнікамі Адміністрацыі прэзыдэнта цалкам правалены, - гэтак пракамэнтаваў лідэр РГА «Пэрспэктыва» Анатоль Шумчанка вынікі перамоваў з кіраўнічкай галоўнага эканамічнага ўпраўленьня Адміністрацыі прэзыдэнта Іннай Мядзьведзевай на выступе перад удзельнікамі мітынга.

Са ловаў Шумчанкі, І. Мядзьведзева заявіла, што ўказ прэзыдэнта № 760, супраць якога пратэстуюць прадпрымальнікі, адменены ня будзе. Пры гэтым, чыноўніца абяцала дакласьці пра вынікі сустрэчы з прадпрымальнікамі кіраўніцтву Адміністрацыі прэзыдэнта.

**Спецвыпуск! Спецвыпуск! Спецвыпуск! Спецвыпуск! Спецвыпуск! Спецвыпуск! Спецвыпуск!**

Распечатай на ксероксе и подари друзьям и знакомым!



**Не проспи! Минск 12.00 21 января Октябрьская площадь**

# Што рабіць?

**Эксклюзыўнае інтэрв'ю Працяг, пачатак на першай старонцы**

**У прадпрымальнікаў няма выбару, як перамагаць.**

Яны павінны ўсьвядоміць што гэтым яны павінны займацца самі і выбудоўваць структуры па тэрытарыяльнаму прынцыпу, пра што я ўжо казаў на плошчы. У кожным гандлёвым цэнтры, на кожным міні-рынку павінны паўстаць рэальныя аб'яднаньні прадпрымальнікаў, якія вылучаць са сваіх шэрагаў лідэраў, будуць створаны страйккамы. А як вядома масы ідуць за кіраўніцтвам. Калі прадпрымальнікі здолеюць гэта зразумець і адчуць гэтую адказнасьць перад часам, перад будучанямі сваіх сем'яў значыць магчыма адбудуцца зьмены. Што тычыцца непасрэдна нашай дзейнасьці, то мы будзем працягваць свае пасьпяховыя дзеяньні і паказваць іншым як трэба працаваць і тое, што мы можам гэтаму навучыць, але гэта павінны рабіць людзі самі. У першаю чаргу гэта павінны рабіць тыя, каго гэта тычыцца. Я б параіў прадпрымальнікам наняць, умоўна кажучы на працу тых, хто працаваў на іх да новага году і зрабіць іх салідарнымі ў сваёй барацьбе.

Палітыкі – гэта бізнэсоўцы і нічога не пачне мяняцца пакуль яны не пачнуць гэтым займацца. Бізнэсоўцы павінны наняць нейкую партыю для прадстаўніцтва сваіх інтарэсаў, ці стварыць сваю, якая будзе прадстаўляць гэтыя інтарэсы. За свабоду трэба плаціць. Вакол нас людзі жывуць паводле законаў, якія паўсталі ня сёньня, а ўчора, і яны за сваю свабоду жыць па закону заплацілі. Літоўцы за свабоду заплацілі ў 1991 годзе. Польская "Салідарнасьць" плаціла за гэта дзесяць год. У Чэхіі за свабоду заплацілі ў 1968 годзе. Прычым яны заплацілі крывёю. Мы за сваю свабоду яшчэ не плацілі. Але трэба плаціць. Трэба заплаціць таму чалавеку, якога я звольніў згодна новаму заканадаўству, каб ён стаяў побач са мною, трэба заплаціць людзям, каб яны даехалі да Менску на наступны мітынг прадпрымальнікаў, высьвятліць, хто зь іх можа паехаць, а хто не. Гэта можа адбыцца толькі такім чынам.

*Гутарку вёў Вітольд Няўрыда*



Кастрычніцкая плошча, Менск

**Калі хтосьці мае нейкія пытаньні, патрэбу тлумачэньняў, жаданьне навучыцца глядзець далей чым ва ўчорашні дзень, далей чым у сёньня – тэлефануйце:**
**+375295446773**



**Как чувствуют себя ИП в Европе и США**

**Анастасия Зеленкова**
**Gazetaby.com**

**Германия**

«Устаревшие формы бизнеса», как оказалось, отлично процветают в цивилизованных странах. В Германии, например, 2/3 предпринимателей зарегистрированы подобным образом — это около 2 млн. бизнесов.

— Реальное количество значительно больше, — уточняет Александр Потупа. — Потому как статистика учитывает только тех, кто уплачивает налог с оборота. А такой налог уплачивают только бизнесы, которые имеют годовой оборот выше 17,5 тысячи евро. При более мелком обороте предприниматель может заниматься бизнесом, не уплачивая этот налог. Вообще налоговая нагрузка, особенно если предприниматель находится в зоне микробизнеса, чрезвычайно упрощена. Все сводится к тому, что в ежегодной налоговой декларации вы указываете доходы и рассчитываетесь по ним.

Такая мерка фактически является стандартом для всех стран Евросоюза. Как раз сейчас в ЕС формируются общие принципы классификации бизнесов, то есть определяются параметры, по которым различают микробизнес, малый бизнес, средний…

**Ближайшие соседи**

Страны бывшего соцлагеря, недавно вступившие в ЕС, вводят ту же классификацию для бизнеса, что и другие. Однако на начальной фазе для них было сделано исключение.

Так, в Литве сумма оборота для микробизнеса установлена до 1,5 млн. евро, а не до двух, как для давних членов ЕС. Это связано с тем, что средние обороты бизнеса в Литве пока ниже.

Уступают пока наши ближайшие соседи Литва и Польша и в количественном соотношении индивидуальных предпринимателей на душу населения (в ЕС этот показатель — 45 предприятий на 1000 человек). Однако, по оценкам специалистов, они развиваются в этом направлении достаточно успешно.

**США**

— В США малый бизнес — это гигантская машина, — отмечает Александр Потупа. — Надо иметь в виду, что он делает 50% ВВП США. Существует даже специальное правительственное ведомство, которое защищает позиции предпринимателей, следит, чтобы на них не давил крупный бизнес.

В США на тысячу человек населения приходится 78 малых бизнесов. Это самый высокий показатель в мире. 80% из этих предприятий зарегистрированы эквивалентно нашим ИП.

# НАКАНАВАНЬНЕ ПЕРАМАГАЦЬ або ЦІ ВАРТЫЯ ВЫ СВАБОДЫ?



**Валадар Цурпанаў**

Камусьці падалося, што 10 студзеня на плошчы ў цэнтры Магілёва адбылася падзея. А як інакш, бо пад 500 чалавек пяць гадзінаў стаялі на марозе.

Да жалю, гэта ня так. Гэты дзень стаўся чарговым днём сораму малога бізнэсу. Сьмеласьць тых, хто прыйшоў на плошчу, не ратуе астатніх… Кажу гэта паводле маральнага права кіраўніка групы сваіх паплечнікаў, якія аказаліся на плошчы адзінымі, хто быў гатовы да разьвязаньня сытуацыі ў любым кірунку. Гэта ёсьць фактам. Сьведкамі і ўдзельнікамі яго і былі тыя, хто адолеў у сабе страх і ўратаваў "малы бізнэс" Магілёва ганьбы.

Аднак і тыя прадпрымальнікі й найманыя работнікі, што прыйшлі на плошчу, аказаліся ў ролі статка бяз пастыра-кіраўніка. Бо фармальныя кіраўнікі (председатели советов каких-то) выявілі сябе не лепей за астатніх. Яны не маглі адказваць за іншых, бо не адказвалі за сябе.

– Яны – баязьліўцы… Яны – недарэкі… Яны – рабы! Як яны зьбіраюцца перамагчы ўладу? Вам не соромна, што вас пашыхтаваў сапожнік? – пытаюць людзі.

Свабоду здабывае той, хто перамагае свой страх. Так, улада – гэта сіла. А супрацьстаяць сіле можа толькі сіла. Дык у чым ваша сіла, панове?

У еднасьці.

У адказнасьці.

У салідарнасьці і ахвярнасьці.

У розуме.

Прыгожыя, зразумелыя словы… А ці багата з вас ведае, што за імі хаваецца? А ці багата хто з вас разумее, ШТО ЗА ВАС АНІХТО НЯ ЗРОБІЦЬ ТАГО, ШТО ВЫ МУСІЦЕ РАБІЦЬ?

У Магілёве вас пад 17 тысячаў. На плошчы было пад 300-350 прадпрымальнікаў і найманых работнікаў. А дзе былі астатнія? Дзе былі іх работнікі? А калі б выйшла палова прадпрымальнікаў і заахвоціла сваіх памочнікаў? А калі б… Хто зразумеў наш зварот: "Прыходзьце 10-га на плошчу з кумам-братам-жонкай-сватам-мужам-дзедам-і-суседам!"???

Аднак жа першую перамогу кожны мусіць дастаць найперш: перамагчы свой страх. За свабоду трэба плаціць. І грошы тут не галоўная плата, ды ўвогульле, грошы – ня плата. Мы плацім сумленьнем. Альбо ня плацім, а тады расплочваца будуць нашыя дзеці-унукі…

Толькі ВЫ САМІ можаце:

– сабрацца ў сваім гандлёвым мейсцы,

– падзяліцца сваімі крыўдамі-думкамі,

– выбраць-прызначыць сапраўдных кіраўнікоў, якім давяраеце, каб вы маглі давяраць ім і на іх спадзявацца,

– вырашыць, што разам рабіць далей,

– ускласьці адказнасьць за арганізацыю вашых супольных дзеяньняў на выбраных кіраўнікоў,

– сьведама і адказна падпарадкавацца загадам-рашэньням кіраўнікоў, каб яны маглі давяраць вам і на вас спадзявацца,

– аб'яднацца ў агульнагарадзкую, а потым у агульнакраёвую лучнасьць і сфармаваць адпаведныя штабы дзеля каардынацыі супольных дзеяньняў дзеля перамогі, дзеля СВАБОДЫ,

– залучыцца падтрымкаю пэнсіянэраў, настаўнікаў, студэнтаў, рабочых – усяго грамадзтва, якое на вашым баку,

– здабыць СВАБОДУ!

НАШ Магілёў
Незалежнае грамадзка - палітычнае выданьне Горада
Выдавец Андрусь Воўкаў, дырэктар Вітольд Няўрыда, карэктар Лех Баліцкі.
Надрукавана на ксэраксе ў горадзе Магілёве. Наклад: 299 ас.
Кантакт: Магілёў, 212017, а/с 46
gazetanm@yandex.ru
Тыражаваньне й распаўсюд усімі зацікаўленымі асобамі дазваляецца й вітаецца. Распаўсюд бясплатны.
НАШ Магілёў